## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

**Заканчваецца падпіска на II квартал 2009 года**

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10120 | 30360 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9570 | 28710 |
| 63858 (ведамасны) | 16170 | 48510 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 14740 | 44220 |



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 САКАВІКА 2009 г. СЕРАДА № 55 (26413)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Ва Урадзе

## Шматдзетныя сем'і будуць забяспечаны жыллём у 2009-2011 гадах

**Дакладней, гаворка ідзе пра тыя шматдзетныя сем'і, якія сёння стаяць на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім разглядаліся меры па забеспячэнні безумоўнага выканання ў гэтым годзе заданняў па жыллёвым будаўніцтве.**

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, пры рэалізацыі праграмы жыллёвага будаўніцтва ў краіне асноўныя акцэнты павінны перамяшчацца ў бок вырашэння жыллёвых праблем грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і ў першую чаргу льготных катэгорый грамадзян, у тым ліку шматдзетных сем'яў. Ён паведаміў, што зараз на ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў знаходзіцца больш за 16 тысяч шматдзетных сем'яў. І дадаў, што запланаванае на сёлета будаўніцтва для іх 2870 кватэр з'яўляецца крайне недастатковым. «Гэтае пытанне было дэталёва разгледжана Урадам сумесна з Нацбанкам і іншымі зацікаўленымі ўстановамі, — заўважыў Віктар Бура. — Мінбудархітэктуры і Мінэканомікі неабходна тэрмінова ўнесці праект рашэння і пабудаваць для гэтай катэгорыі грамадзян не менш за 4 тысячы кватэр. Усе астатнія шматдзетныя сем'і павінны быць уключаныя ў адпаведныя спісы забудоўшчыкаў, і ў залежнасці ад цыкла будаўніцтва будынкаў у 2010, 2011 гадах жыллёвыя патрэбы ўсіх 16 тысяч павінны быць задаволеныя».

Што датычыцца сёлетняга задання па будаўніцтве, то, нагадаў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, трэба ўвесці 6 мільёнаў квадратных метраў жылля. «Урад і Нацыянальны банк забяспечылі дастатковыя рэсурсы, каб увод жылля быў выкананы ў поўным аб'ёме», — падкрэсліў кіраўнік Урада. Яго думку падзяляе і Віктар Бура, які назваў заданне цалкам рэальным для выканання. Ён зазначыў, што ў параўнанні з 1987 годам, калі ў рэспубліцы быў дасягнуты максімум па ўзвядзенні жылля — 5878 тысяч квадратных метраў, сёння будаўнічы комплекс мае больш дасканалае абсталяванне, новыя тэхналогіі будаўніцтва і вытворчасці будматэрыялаў.

За студзень-люты, праінфармаваў віцэ-прэм'ер, у цэлым у Беларусі ўведзена ў эксплуатацыю 542,3 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых памяшканняў, ці 9% гадавога задання, што склала 108% да паказчыкаў аналагічнага леташняга перыяду. За першы квартал, як чакаецца, паводле папярэдніх звестак, у эксплуатацыю будзе ўведзена не менш за 1 мільён квадратных метраў, ці 16,7% ад гадавога задання. Разам з тым ён адзначыў, што Урад гэта не можа задавальняць, таму што за два першыя месяцы летась удалося пабудаваць больш за 1,2 мільёна квадратных метраў.

Для нарошчвання аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва, было адзначана віцэ-прэм'ерам, Урадам і Нацыянальным банкам пастаянна прымаюцца неабходныя рашэнні. У прыватнасці, на пасяджэнні ўзгадвалася аб тым, што ў рэспубліцы было пашырана кола грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў і аднаразовых бясплатных субсідый. Прынятае рашэнне па безаўкцыйным выдзяленні зямельных участкаў грамадзянам для ажыццяўлення жыллёвага будаўніцтва. З «Беларусбанкам» дасягнутая дамоўленасць аб бесперабойным льготным крэдытаванні грамадзян. Прычым пасля поўнага асваення запланаваных сродкаў будуць вырашацца пытанні па дадатковым фінансаванні. Акрамя ўжо згаданых і вядомых захадаў, вядзецца і пастаянная работа па зніжэнні кошту будаўніцтва жылля, у тым ліку для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Паводле слоў Віктара Буры, зацверджаны план мерапры-емстваў, якія накіраваныя на скарачэнне выдаткаў падрадных арганізацый, прынятыя рашэнні па зніжэнні адпускных цэнаў на будматэрыялы і канструкцыі. Для дадатковага далучэння сродкаў грамадзян у будаўніцтва, а таксама максімальнага выкарыстання апрацоўчых матэрыялаў айчыннай вытворчасці, поўнай загрузкі рабочых апрацоўчых спецыяльнасцяў, дзейсным захадам, на думку віцэ-прэмера, павінна стаць увядзенне абавязковага выканання апрацоўчых работ, устаноўкі ўбудаванай мэблі, сантэхнікі, электрапліт пры будаўніцтве жылля ў ЖБК. Адпаведны нарматыўны акт, заўважыў ён, распрацаваны.

На падыходзе яшчэ адзін важны праект, што зараз прапрацоўваецца і датычыць зменаў па тэрмінах карыстання крэдытамі на будаўніцтва жылля. Як вядома, зараз Беларусбанк дае крэдыты людзям, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на агульных падставах тэрмінам да 15 гадоў, льготных — да 20. Дык вось, як лічыць Віктар Бура, у краіне неабходна працягваць работу па ўдасканаленні парадку крэдытавання грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у частцы павелічэння тэрміну вяртання крэдытаў, што ім даюцца.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## У Брэсцкую вобласць прыляцелі першыя буслы

**У Беларусь белыя буслы звычайна прылятаюць у другой палове сакавіка. Гэта адзін з чатырох відаў птушак, якія прапанаваны ў якасці індыкатараў надыходу вясны агульнаеўрапейскай кампаніі «Жывая вясна».**

У цёплы сезон у нас жыве каля 13 тысяч пар белых буслоў. Гняздуюцца яны галоўным чынам у Палессі. Беларусь уваходзіць у пяцёрку еўрапейскіх краін, якія найбольш падабаюцца гэтым птушкам. Па колькасці пар Беларусь саступае толькі Польшчы, Украіне, Турцыі і Іспаніі. Харчуюцца буслы земнаводнымі, буйнымі насякомымі і чарвякамі. Гэтыя прыгожыя буйныя птушкі адлоўліваюць палёвак, яшчарак і змей.

Спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан Шайкін адзначыў што, убачыўшы першых белых буслоў, чытачы «Звязды» могуць падзяліцца сваімі назіраннямі і занесці інфармацыю на сайт www.springalive.net. Прыняць удзел у кампаніі «Жывая вясна» можа любы жыхар Беларусі.

Аб сваіх назіраннях можна паведаміць у офіс АПБ па тэлефоне 8 017 263 06 13, пераслаць і ў выглядзе SMS-паведамленняў на кароткі нумар 0841. Для абанентаў velcom паслуга каштуе 220 рублёў. а МТС — 390.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прамыя лініі

## АНКАЎРАЛОГІЯ І АНКАГІНЕКАЛОГІЯ

Дыягностыка і лячэнне анкалагічных захворванняў, у прыватнасці, анкаўралагічных (прастата, мачавы пузыр, ныркі) і анкагінекалагічных (рэпрадуктыўная сістэма жанчын) будуць у цэнтры ўвагі нашай чарговай «прамой лініі» па медыцынскай тэматыцы. На вашы пытанні адкажуць спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава — **намеснік дырэктара па навуковай працы, доктар медыцынскіх навук Сяргей Анатольевіч КРАСНЫ** і **загадчыца аддзела анкагінекалогіі, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА.**

*«Прамая лінія» адбудзецца 30 сакавіка, у панядзелак, з 14.00 да 15.00 па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.*

**Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).**

## УСЁ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

Размеркаванне — не менш адказны час у жыцці маладых людзей, чым прыёмная кампанія. Ці абавязана камісія па размеркаванні задавальняць персанальныя заяўкі арганізацый на выпускнікоў? Ці павінна брацца пад увагу сямейнае становішча выпускніка? Якія прывілеі дае выпускнікам статус маладога спецыяліста? Якія могуць быць падставы для пераразмеркавання? Ці можна апратэставаць вынікі размеркавання? Як размяркоўваюцца выпускнікі магістратуры? На ўсе пытанні, якія датычацца забеспячэння маладых людзей першым працоўным месцам і працы па размеркаванні, вам адкажуць **старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** і **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК,** з якімі «Звязда» арганізуе завочную «прамую» лінію.

**З пытаннямі можна звяртацца ў рэдакцыю па нумары (017) 287 17 41 (Надзея НІКАЛАЕВА).**

## Міншчына дэманструе культурныя здабыткі

**Заўтра, 26 сакавіка, на Кастрычніцкай плошчы сталіцы распачнецца дзейства, да якога маюць дачыненне 1,5 мільёна насельніцтва нашай краіны — творчая справаздача Міншчыны. Мерапрыемства прысвечана 65 гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

На яго першую частку запрашаюцца ўсе ахвотныя: а 16 гадзіне проста на плошчы ля Палаца Рэспублікі будуць усталяваны салодкія гандлёвыя рады, 100 майстроў народнай творчасці выставяць на продаж свае ўнікальныя вырабы. Гэта будзе сапраўдны святочны гандаль з усімі рысамі старадаўніх беларускіх кірмашоў — відовішчамі, тэатрамі, гульнямі, шынкамі і корчмамі.

А палове шостай вечара адкрыецца выстаўка пленэрных работ навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў і мастацкіх школ Мінскай вобласці. А яшчэ праз гадзіну ў Вялікай зале Палаца Рэспублікі пачнецца справаздачны канцэрт творчых калектываў Міншчыны, на які, на жаль, білетаў ужо няма, а запрашэнняў не хапіла ўсім ахвотным.

— Гэты канцэрт — вынік пяцігадовай працы, — расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы аблвыканкама Таццяна ДЗЕДУХ.** — На ім будзе прадэманстравана ўсё самае лепшае, што мы маем, выступяць практычна ўсе заслужаныя калектывы вобласці, будуць закранутыя такія сур'ёзныя тэмы, як сям'я, Бацькаўшчына, вызваленне Беларусі, дзеці і моладзь.

— Мінулы год быў вельмі насычаны для сферы культуры, — расказаў **начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Анатоль АКУШЭВІЧ.** — Мы святкавалі 70-годдзе Мінскай вобласці, 50-годдзе горада Салігорска, у Барысаве правялі Дзень беларускага пісьменства...

Летась на ўмацаванне матэрыльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры з абласнога бюджэту было выдаткавана каля 42 млрд беларускіх рублёў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## «СУТЫКНУЛІСЯ» ЛАКАМАТЫЎ І ДВА ЛАСІ

Ад дзяжурнага Жлобінскага АУС на транспарце ў Жлобінскую міжрайінспекцыю паступіла паведамленне, што на чыгунцы Жлобін—Гомель лакаматывам смяротна траўмаваныя два ласі. Дзяржінспектары, прыбыўшы на месца, вызначылі, што ў выніку сутыкнення загінулі дарослыя самец і самка. Пры даследаванні прылеглай тэрыторыі слядоў пагоні чалавека або драпежных жывёл за парнакапытнымі не знойдзена. Тушы ласёў перададзены арандатару паляўнічых угоддзяў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Жыллё маё

## У РЭГІЁНАХ АРЭНДА ТАННЕЕ ВЫБАРАЧНА...

**Яшчэ летась, у верасні, з Оршы паведамлялі, што жыць бескватэрным у гэтым невялікім правінцыйным гарадку значна танней, чым у сталіцы. Зняць аднапакаёвую кватэру тады можна было прыкладна за 100 долараў, а ў той жа час у Мінску арэнда невялікіх кватэр дасягала часам 300—350 долараў. Слабы сезонны попыт і істотная дэвальвацыя абвалілі доларавы цэннік сталічнай арэнды, сёння сярэднія аднапакаёўкі ў не самых прывабных мікрараёнах Мінска можна адшукаць па 180—200 долараў за месяц. А ў Оршы арэнда аднапакаёвага жылля і зараз прапануецца кліентам за тыя ж 100 долараў. Няўжо сталічная тэндэнцыя па патанненні арэнды да асобных рэгіёнаў яшчэ не «даляцела»?**

### ПОПЫТ У БРЭСЦЕ ЗНІЗІЎСЯ Ў ТРЫ РАЗЫ

Заходні рэгіён краіны па сегменце выкарыстання жыллёвай нерухомасці быў бадай самым актыўным і дарагім, пасля сталічнага рынку арэнды. Блізкасць гэтага фарпоста да межаў з Польшчай прыцягвала ў горад дробных бізнэсменаў, якія здымалі мясцовыя кватэры, часам у якасці перавалачных пунктаў. Новы кошт еўрапейскай валюты разам з сусветным фінансавым крызісам значна паменшыў аб'ёмы падобнага бізнэсу, пасля чаго попыт на брэсцкія кватэры пачаў зніжацца.

Яшчэ ў лістападзе—снежні мінулага года арэнда ліквідных аднапакаёвак у гэтым горадзе прапанавалася па 160—170 долараў. Сёння сярэдні кошт прапановы такога жылля знізіўся да 140—150 долараў, але... Патэнцыйныя кватаранты па такім цэнніку здымаюць невялікія кватэры вельмі неахвотна. Паводле інфармацыі намесніка кіраўніка найбуйнейшага агенцтва нерухомасці Брэста Івана Невада, большасць іх кліентаў заказваюць у агенцтве аднапакаёўкі па кошце ад 100 да 130 долараў. Гаспадары двухпакаёвых кватэр выстаўляюць сваё жыллё ў сярэднім за 200—220 долараў, аднак рэальны попыт на такое жыллё — у межах 150—160 долараў. Сярэдні кошт трохпакаёвых кватэр ужо знізіўся да 250 долараў, але ўжо зараз магчыма адшукаць невялікую трохпакаёўку і за 200 USD. Спадар Невад упэўнены, што да пачатку лета сярэдні кошт арэнды ўсіх тыпаў кватэр у Брэсце знізіцца прыкладна на 20—30 працэнтаў.

### НЕВЫСОКАЯ АРЭНДА ГОМЕЛЯ ПАТАННЕЕ ЯШЧЭ

Кошт арэнды стандартных маленькіх кватэр у гэтым горадзе амаль ніколі істотна не «зашкальваў» за сярэднестатыстычныя 100 долараў. Выключэнне складае толькі сезоннае павелічэнне актыўнасці попыту ў жніўні—верасні, калі ў Гомель наведваецца новая хваля студэнтаў. Тады кошт аднапакаёвак можа дасягаць нават 130 долараў.

Паводле інфармацыі галоўнага спецыяліста аднаго з гомельскіх агенцтваў нерухомасці Дзмітрыя Бікуля, сёння на мясцовым рынку арэнды ўсё часцей з'яўляюцца аднапакаёўкі па кошце 80—90 долараў, а ў старых пяціпавярховых дамах невялікія «хрушчоўкі» можна адшукаць і за 70 долараў.

Рыэлтары агенцтва адзначаюць, што за апошні месяц двухпакаёвыя кватэры патаннелі прыкладна на 10 працэнтаў, сярэдні кошт іх сёння складае 120—140 долараў. Даволі слабым попытам сёння карыстаюцца і трохпакаёвыя кватэры, цэннік на якія вагаецца ў межах 150—160 долараў плюс кватплата. Бліжэй да цэнтра ў сучасных дамах прасторныя двухпакаёвыя і трохпакаёвыя кватэры каштуюць на 100—150 долараў даражэй, але попыт і на такое жыллё невялікі.

Эксперты мясцовага жыллёвага рынку адзначаюць, што слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры ў старых пяціпавярховых дамах на крайніх паверхах могуць да лета патаннець яшчэ на 10—20 долараў.

### У ГРОДНЕ ПЛАНУЕЦЦА ПЛАЎНАЕ ЗНІЖЭННЕ КОШТУ АРЭНДЫ

Эксперты дзяржаўнай рыэлтарскай канторы гэтага абласнога цэнтра адзначаюць, што з пачатку года ў Гродне цэннікі жыллёвай арэнды ўжо знізіліся прыкладна на 10—15 працэнтаў. Сёння аднапакаёвыя кватэры здымаюцца за 100—110 долараў, двухпакаёвыя — за 140—150, трохпакаёвыя — за 150—160 долараў плюс кватплата.

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці фіксуюць часовую стабілізацыю цэнаў на рынку жыллёвай арэнды. Разам з тым, рыэлтары прагназуюць, што да лета арэнда не зусім якаснага жылля будзе плаўна таннець у тэмпе каля 2—3 працэнтаў у месяц.

### АРЭНДА ЭЛІТНАГА ЖЫЛЛЯ Ў МАСКВЕ ПАТАННЕЛА АДРАЗУ НА 25 ПРАЦЭНТАЎ

Менавіта на чвэрць за два апошнія месяцы ў сярэднім патаннелі элітныя кватэры ў сталіцы Расіі. Зараз такое жыллё здаецца ў арэнду па кошце ад 1,5 да 30 тысяч долараў у месяц. Да крызісу арэндныя стаўкі складалі ад 2,5 да 60 тысяч долараў. Асноўны аб'ём прапановы элітных кватэр у Маскве складае жыллё па кошце 5—6 тысяч долараў у месяц. Не вельмі істотна за апошні час патаннелі ў Маскве невялікія стандартныя кватэры. На ўскрайку сталіцы зараз можна адшукаць аднапакаёўкі і па 400—500 долараў, а часам і за 300—350, але вельмі невысокай якасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ АДМЯНІЛА КАНСУЛЬТАЦЫІ З УКРАІНАЙ У АДПЛАТУ ЗА ЯЕ ДАМОЎЛЕНАСЦІ З ЕС

**Расія адкладае міжурадавыя кансультацыі з Украінай у сувязі з вынікамі міжнароднай канферэнцыі ў Брусэлі, прысвечанай мадэрнізацыі ўкраінскай газатранспартнай сістэмы. Аб гэтым заявіў у аўторак прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў на пасяджэнні Савета бяспекі краіны.**

«Планавалася адмысловая камісія з Украінай, але адбылася канферэнцыя паміж Украінай і Еўрасаюзам, прысвечаная пытанням інвеставання ў ГТС Украіны, — заявіў Мядзведзеў. — Гэта была сур'ёзная маштабная падзея, якая завяршылася прыняццем дэкларацыі».

«Змест гэтай дэкларацыі, як мінімум, выклікае шэраг пытанняў», — лічыць прэзідэнт РФ. Ён прапанаваў перанесці міжурадавую сустрэчу на нявызначаны тэрмін, каб ацаніць наступствы прыняцця дэкларацыі. Кансультацыі паміж прэм'ерамі дзвюх краін раней планаваліся на гэты тыдзень.

Кіраўнік расійскага ўрада Уладзімір Пуцін пагадзіўся з меркаваннем прэзідэнта. «Мы ўважліва назіралі за вынікамі канферэнцыі і прынятай дэкларацыяй і, вядома, у нас узнікае шэраг пытанняў, — сказаў ён. —...Зразумела, што газ не можа ўзяцца ні адкуль, акрамя як з Расіі, — працягнуў Пуцін. — Але з намі ніхто гэтае пытанне не абмяркоўваў».

Напярэдадні расійскі прэм'ер прыстрашыў пераглядзець адносіны з Еўрасаюзам, калі яны будуць падобным чынам ігнараваць інтарэсы Масквы.

### ЛАЦІНААМЕРЫКАНЦЫ І ЦЕМНАСКУРЫЯ БОЛЬШ ЗА БЕЛЫХ ПАЦЯРПЕЛІ АД БЕСПРАЦОЎЯ



**Лацінаамерыканцы і цемнаскурыя ў ЗША хутчэй страчваюць працу ў перыяд крызісу, чым белае насельніцтва краіны, паведамляе AP.**

З пачатку эканамічнай рэцэсіі доля беспрацоўных сярод лацінаамерыканцаў вырасла на 4,7 працэнта да 10,9 працэнта, сярод цемнаскурых — на 4,5 працэнта да 13,4 працэнта, а сярод белых — на 2,9 працэнта да 7,3 працэнта: такія звесткі прыводзіць Бюро працоўнай статыстыкі ў міністэрстве працы ЗША.

### АМАТАРЫ СВІНІНЫ І ЯЛАВІЧЫНЫ БОЛЬШ РЫЗЫКУЮЦЬ ПАМЕРЦІ АД РАКУ І ІНФАРКТУ



**Падчас нядаўніх даследаванняў амерыканскія навукоўцы атрымалі звесткі аб тым, што празмернае ўжыванне ў ежу чырвонага мяса: ялавічыны, свініны і бараніны — павялічвае рызыку смерці на працягу 10-гадовага перыяду, перадае ВВС.**

Група навукоўцаў з Нацыянальнага амерыканскага інстытута па вывучэнні ракавых захворванняў абследавала больш за паўмільёна чалавек. Па выніках эксперыменту, людзі, якія спажывалі каля 160 грамаў мяса чырвонага колеру ў дзень, сутыкаюцца з большай рызыкай памерці ад раку або сардэчна-сасудзістых захворванняў, чым тыя, хто спажывае каля 25 грамаў (адна лустачка вяндліны).

Тыя з абследаваных, хто наогул не ўжываў чырвонага мяса, а еў толькі белае мяса рыбы і птушак, мелі найменшую рызыку памерці ад раку і сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Паводле меркавання навукоўцаў, усяму віной канцэрагены, якія вылучаюцца пры цеплавой апрацоўцы мяса. Абсмажанае мяса становіцца асноўнай крыніцай насычаных тлушчаў, якія ўдзельнічаюць ва ўтварэнні ракавых пухлін грудзей і прамой кішкі, а таксама павышаюць крывяны ціск і ўзровень халестэрыну. Даследчыкі ўпэўненыя, што змяншэнне долі мясных прадуктаў у штодзённым рацыёне магло б паменшыць смяротнасць сярод мужчын на 11%, і сярод жанчын — на 16%.

### КІТАЙ ПРАПАНАВАЎ ЗАМЯНІЦЬ ДОЛАР НОВАЙ ВАЛЮТАЙ

**Манетарныя ўлады Кітая прапанавалі свой план рэфармавання сусветнай фінансавай сістэмы, які прадугледжвае стварэнне міжнароднай рэзервовай валюты.**

У праграме рэфармавання глабальнай фінансавай сістэмы нічога не гаворыцца пра долар, аднак некалькі разоў крытыкуецца сучасная сістэма, у якой амерыканская валюта дамінуе на рынку. Паводле звестак Цэнтрабанка Кітая, міжнароднай рэзервовай валютай маглі б стаць адмысловыя правы запазычання (SDR) — штучны аплатны сродак МВФ, прывязаны да кошыка валют і ўведзены ў 1969 годзе.


ISSN 1990 - 763X


*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.03.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 787,00 |
| ▼ 1 еўра | 3 790,04 |
| 1 латвійскі лат | 5 346,25 |
| 1 літоўскі літ | 1 098,20 |
| 1 чэшская крона | 141,33 |
| 1 польскі злоты | 838,03 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 83,76 |
| 1 украінская грыўня | 346,21 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 33,2726 |
| 10 UAH | 41,3324 |
| 1000 BYR | 11,9557 |
| EUR | 45,2674 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 30 апреля 2009 года

Минский городской центр недвижимости

**Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 40 по ул. Янковского в г. Минске**

| № лота | Наименование объекта | | | Площадь, кв.м | | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | № квартиры | количество комнат | этаж | общая | жилая | | |
| 1 | 1 | 2 | 1 | 57,6 | 31,0 | 149 760 000 | 14 976 000 |
| 2 | 7 | 1 | 2 | 42,9 | 17,9 | 111 540 000 | 11 154 000 |
| 3 | 15 | 2 | 3 | 57,5 | 31,0 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 4 | 23 | 1 | 4 | 43,1 | 18,0 | 112 060 000 | 11 206 000 |
| 5 | 31 | 2 | 5 | 57,6 | 31,1 | 149 760 000 | 14 976 000 |
| 6 | 39 | 1 | 6 | 43,0 | 18,0 | 111 800 000 | 11 180 000 |
| 7 | 47 | 3 | 7 | 75,2 | 45,1 | 195 520 000 | 19 552 000 |
| 8 | 53 | 1 | 8 | 43,1 | 18,0 | 112 060 000 | 11 206 000 |
| 9 | 59 | 2 | 9 | 57,6 | 31,2 | 149 760 000 | 14 976 000 |
| 10 | 65 | 1 | 10 | 43,0 | 18,0 | 111 800 000 | 11 180 000 |
| 11 | 71 | 2 | 11 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 12 | 77 | 1 | 12 | 42,8 | 17,9 | 111 280 000 | 11 128 000 |
| 13 | 83 | 2 | 13 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 14 | 89 | 3 | 13 | 75,0 | 45,1 | 195 000 000 | 19 500 000 |
| 15 | 91 | 1 | 14 | 42,8 | 18,0 | 111 280 000 | 11 128 000 |
| 16 | 95 | 1 | 14 | 42,9 | 18,0 | 111 540 000 | 11 154 000 |
| 17 | 99 | 2 | 15 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 18 | 101 | 2 | 15 | 57,5 | 31,0 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 19 | 107 | 1 | 16 | 42,7 | 17,9 | 111 020 000 | 11 102 000 |
| 20 | 113 | 2 | 17 | 57,5 | 31,1 | 149 500 000 | 14 950 000 |
| 21 | 115 | 2 | 17 | 57,6 | 31,2 | 149 760 000 | 14 976 000 |
| 22 | 119 | 1 | 18 | 42,9 | 18,0 | 111 540 000 | 11 154 000 |
| 23 | 123 | 1 | 18 | 42,7 | 17,9 | 111 020 000 | 11 102 000 |
| 24 | 125 | 2 | 19 | 57,2 | 30,9 | 148 720 000 | 14 872 000 |
| 25 | 131 | 3 | 19 | 74,7 | 45,0 | 194 220 000 | 19 422 000 |

1) Аукцион состоится **30 апреля 2009 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 3-й этаж, малый зал, ауд. 310, регистрация участников – в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические лица – граждане Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы (57 430 руб.).

Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО БПС-Банк по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе по письменному заявлению участника аукциона на лицевой его счет с указанием полных банковских реквизитов для возврата денежных средств (задатка).

Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном для физических лиц порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 15 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 15 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона УП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с 1 апреля 2009 г. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 29 апреля 2009 г. до 16.00 включительно. (Перерыв на обед: с 13.00 до 14.00). Телефон для справок: 227-40-22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 1 апреля 2009 г. по понедельникам и средам в присутствии сотрудников МАПИД с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Янковского, 40. Телефоны для справок: 207-19-15; 208-58-12.

УНП 190398583

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 сакавіка 2009 г.
№ 11 (163)


ПРАЦЯГ ТЭМЫ

## ВОСЬ ТАКОЕ МАЛАКО...

### Хто вярнуў закупачныя цэны, а хто не спяшаецца

**Як толькі прайшла інфармацыя ў СМІ пра памяншэнне закупачных цэнаў на малако з прыватнага сектара, вяскоўцы пачалі звяртацца ў розныя інстанцыі, найперш у сельсаветы, каб атрымаць тлумачэнне па сітуацыі, якая склалася. Былі такія звароты і да Алены ПЫШНЯК, старшыні Беражноўскага сельскага Савета Столінскага раёна. І хоць закупам малака ў Беражным займаецца мясцовы СВК, але у насельніцтва — 665 кароў, сельсавет зацікаўлены ў стабільнай рабоце гэтага кірунку.**

Зразумела, што людзі хвалююцца, хоць цэны пакуль і не мяняліся. А **старшыня Манькавіцкага сельскага Савета Столінскага раёна Наталля РАСЬКО** сказала так: «Мы займаемся нарыхтоўкай малака насельніцтва і атрымалі паперу, у якой нас папярэджвалі аб памяншэнні цэнаў за літр малака да 600 рублёў. Але пакуль прыйшоў вызначаны тэрмін, усё вярнулася назад. Аб тым, што памяншэння цаны не будзе, нам паведамілі па тэлефоне. Думаю, што нехта своечасова адхіліў неабдуманы крок малочнага прадпрыемства.

У нас не так многа кароў — 336. Але для сельсавета, які мае такі-сякі прыбытак ад работы па нарыхтоўцы, і гэтыя грошы не лішнія. Людзі ж сталі гаварыць, што ў выпадку зніжэння цаны яны малако зборшчыкам не панясуць. У нас Столін блізка, вяскоўцы наважваліся везці сваю прадукцыю ў горад на рынак, каб старгаваць за яе большыя грошы. Думаю, што гэта вельмі правільнае рашэнне — вярнуць былыя закупачныя цэны. Калі мы звяртаемся да людзей, яны нас разумеюць: летась на Столінскім філіяле Пінскага малаказавода праводзілі рэканструкцыю, вяскоўцаў папярэдзілі, што два дні малака прымаць не будуць. Ніхто слова не сказаў. Гэтак жа і яны разлічваюць на разуменне: чаму мы павінны губляць грошы на прадукцыі, якая дастаецца вялікай працай?»

— Нацярпеліся мы справядлівага абурэння, наслухаліся нараканняў, пакуль прымалі малако па 600 рублёў, — прадоўжыла тэму **Ганна ХАТЭНКА, старшыня Шаняўскога сельскага Савета Пружанскага раёна**. — Наша малочнае прадпрыемства пасляшалася прачытаць пастанову Саўміна на сваю карысць і цану паменшыла. Але некалькі дзён таму мы атрымалі доўгачаканую вестку, што ўсё мяняецца і цэны вяртаюцца на ранейшы ўзровень.

Для нашых малаказдатчыкаў гэта важна. Летась вяскоўцы здалі ад каровы па 3592 кілаграмы малака. Падлічыце, колькі гэта будзе, калі на літры страціць 65 рублёў. Для многіх жыхароў невялікіх населеных пунктаў карова застаецца сапраўднай карміцелькай. Асабліва там, дзе перастаў існаваць калгас — землі далучаюць да іншых гаспадарак, як правіла, скарачаецца інфраструктура, менш становіцца магчымасцяў зарабляць грошы. Ёсць такія тэрыторыі і ў нашым сельсавеце. Там некаторыя людзі трымаюць па дзве, а то і тры каровы, гэта забяспечвае ім паўнацэнную па вясковых мерках зарплату. Па сельсавеце прыватны статак сёлета вырас на дзве галавы ў параўнанні з мінулым годам. Для замены старых кароў людзі пакінулі 18 цялушак. Значыць, справа перспектыўная,назіраецца развіццё. Цалкам зразумела, чаму людзі так непакоіліся.

А вось Кобрынскі малочны завод не спяшаецца пераглядаць цэны, якія ўвёў адразу пасля вядомай пастановы. Як паведаміў карэспандэнту «МС» **старшыня Батчынскага сельскага Савета Кобрынскага раёна Аляксандр КОРЖАК**, іх гаспадарча-разліковае прадпрыемства збірае малако, за якое плацяць па новай цане — 600 рублёў за літр. Аляксандр Антонавіч заўважыў, што прыватны статак у сельсавеце невялікі — 152 каровы. І без зніжэння цэнаў не ўсіх удаецца ўгаварыць стаць малаказдатчыкамі. Паводле слоў старшыні, гэта зразумела: у многіх у горадзе жывуць дзеці, якім бацькі дапамагаюць малаком, смятанай, тварагом. Заўважана, што ў выхадныя дні, калі прыязджаюць сваякі-гараджане, гаспадыні выносяць менш малака. Але ж тыя, хто здае, хочуць мець стабільную капейку да пенсіі. «Пакуль яшчэ не надышла пара вялікага малака, то і скаргі не носяць, так бы мовіць, масавы характар, — гаворыць старшыня Савета, — але звароты ўжо ёсць. Думаю, што мы з маімі калегамі будзем настойліва ўздымаць гэта пытанне ў раёне, бо ў многіх раёнах вярнуліся да ранейшай цаны».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДА ЗЯМЛІ З ЛЮБОЎЮ

## ДАТАЦЫІ НЕ ПРАДУГЛЕДЖАНЫ

**Дзіцячыя пляцоўкі, інфармацыйныя шчыты, новыя агароджы набыў «горад Ізяслава» за сродкі ад аўкцыёнаў**

**...З надвор'ем, мякка кажучы, не пашанцавала, таму наша знаёмства з Заслаўскім добраўпарадкаваннем пачалося з мясцовых фотаздымкаў, зробленых па выніках конкурсу-агляду сярод аб'ектаў сацыяльна-культурнага і вытворчага прызначэння, які праводзіцца ў горадзе не адзін дзясятак гадоў. Асабліва ўразілі адмысловыя фантаны Заслаўскага цэха насосных станцый, якія відавочна ўпрыгожылі гарадскія ландшафты.**



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**Штогод Заслаўе наведвае каля 30 тысяч турыстаў. Тут сапраўды ёсць што паглядзець: варта ўзгадаць гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», этнаграфічны комплекс «Млын» з сапраўднай кузняй і «Хатай завознікаў», Музей-дот, адзіны ў краіне Музей міфалогіі лесу, гарадзішча «Замэчак», дзе захаваліся старадаўнія абарончыя валы, шматлікія помнікі гісторыі і архітэктуры. Горад з'яўляецца сапраўднай турыстычнай мекай і таму шмат увагі надае свайму знешняму выгляду. Асабліву актуальнасць пытанне добраўпарадкаванне набыло сёлета: па-першае, 2009 год абвешчаны ў краіне Годам роднай зямлі, па-другое, горад пачынае рыхтавацца да свайго 1025-годдзя, якое адзначыць у 2010-м.**

— Нам хочацца, каб 2009 год, які папярэднічае юбілею Заслаўя, стаў для нас знакавым у плане добраўпарадкавання, — патлумачыла **старшыня Заслаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Ніна БУХАВЕЦ**. — Мы папрасілі ўсіх кіраўнікоў гарадскіх прадпрыемстваў і арганізацый узяць самы актыўны ўдзел у сёлетнім конкурсе-аглядзе. Летась адгукнуліся толькі ўстановы адукацыі і некалькі вытворчых прадпрыемстваў. Не даслала заяўку нават служба ЖКГ, якая непасрэдна займаецца добраўпарадкаваннем горада. Паралельна з конкурсам сярод арганізацый у нас заўсёды праводзіцца конкурс-агляд на вызначэнне дома ўзорнага ўтрымання.

Шматпавярховыя дамы ў конкурсе не ўдзельнічалі, хаця пэўныя станоўчыя напрацоўкі ёсць і тут. Напрыклад, за сродкі жыхароў у горадзе адрамантаваны 31 пад'езд. Такі фінансавы ўдзел у рамонтных работах спрыяе павышэнню агульнай культуры і выхаванасці людзей, лічыць Ніна Пятроўна, ашчаднаму стаўленню да жылога фонду. Сёння ў горадзе дзейнічае 13 вулічных і 17 дамавых камітэтаў, якія таксама актыўна дапамагаюць вырашаць пытанні добраўпарадкавання. Днямі на пасяджэнні гарвыканкама было зацверджана адпаведная гадавая праграма па навядзенні парадку. Акрамя мерапрыемстваў ЖКГ, у ёй прапісаны пералік работ, выкананне якіх ускладзена на мясцовыя ўстановы і арганізацыі. «За кожным прадпрыемствам замацавана пэўная тэрыторыя, якую яно абавязана дагледзець. Акрамя падтрымання парадку, мы патрабуем азелянення, наяўнасці кветкавых кампазіцый, клумбаў, — расказвае старшыня гарсавета.— Усе прыначныя пункты, дзе знаходзяцца кіёскі прадпрымальнікаў, крамы прыватнага гандлю павінны быць пафарбаванымі і ўпарадкаванымі».

...Бюджэт Заслаўя на 2008 год планаваўся ў памеры 356,9 млн рублёў. Дзякуючы актыўнаму выкарыстанню пералічаных ва Указе № 21 крыніц даходаў, горад летась самастойна зарабіў 917,9 млн рублёў. Крыніцамі папаўнення з'яўляліся зямельны падатак, падатак на нерухомасць, дзяржпошліна, даходы ад здачы ў арэнду памяшканняў, арэнда зямельных участкаў, а таксама даходы ад аўкцыёнаў. «Пад будаўніцтва жылля летась мы прадалі з аўкцыёну 8 зямельных участкаў, атрымалі 393 млн рублёў», — кажа старшыня гарсавета. Усяго ў 2008 годзе аўкцыёны прынеслі ў казну горада 517,5 млн рублёў, у тым ліку 82,5 млн — ад аўкцыёну, праведзенага ў канцы 2007 года.

Паколькі ў Заслаўі існуе жыллёва-камунальная служба, якая фінансуецца з бюджэту раёна і мае асобны артыкул расходаў «на добраўпарадкаванне горада», у самім гарадскім бюджэце такога расходнага артыкула не прадугледжана. З улікам гэтага грошы, якія былі атрыманы ад аўкцыёнаў, дэпутаты гарсавета вырашылі скіраваць на закупку і ўстаноўку новых агароджаў на цэнтральных вуліцах горада — Вялікай, Пуцейцы і Савецкай. (Спачатку гарвыканкам прапанаваў мясцовым жыхарам самім паўдзельнічаць у аплаце работ па замене агароджы, але падтрымкі не знайшоў.)

Частку «аўкцыённых» сродкаў гарадскі Савет дэпутатаў накіраваў на закупку двух сучасных дзіцячых гульнявых пляцовак. Адну мяркуецца ўстанавіць у першым мікрараёне, другую — у раёне індывідуальнай забудовы «Гуры». Частка сродкаў пайшла на выраб чатырох поўнакаляровых інфармацыйных шчытоў з планам горада, якія паставілі на галоўных уездах у Заслаўе.

У найбліжэйшых планах мясцовых уладаў — праведзенне чаргавага аўкцыёну, дзе мяркуецца выставіць на продаж яшчэ 7 зямельных участкаў. Стартавая цана большасці з іх па мерках Мінскага раёна даволі сціплая — ад 3 да 12 млн рублёў. Сума прыбытку гарсавета ў кожным канкрэтным выпадку залежыць ад попыту і фінансавых магчымасцяў удзельнікаў аўкцыёну. Рэкордам для Заслаўя стаў продаж аднаго зямельнага ўчастка за 90 млн рублёў (пры стартавай цане ў 22 млн).

Памер бюджэту Заслаўя на гэты год складае 447,1 млн рублёў. Датацыі сёлета ў ім не прадугледжаны.

...У 2008 годзе жыллёва-камунальнай службе Заслаўя на добраўпарадкаванне горада было выдаткавана 600 млн рублёў. Значная частка гэтых грошай была выдаткавана на рамонт праезнай часткі вуліц. Усяго за мінулы год было выканана работ па паляпшэнні дарог на суму 1,3 млрд рублёў. «Лічба салідная, аднак недастатковая, — тлумачыць Ніна Пятроўна. — У нашых камунальных службаў ёсць праект добраўпарадкавання вуліцы Тэльмана, на рэалізацыю якога патрэбна 520 млн рублёў. І гэта на адну толькі вуліцу!»

Асаблівую заклапочанасць у старшыні выклікае адсутнасць у Заслаўі свайго ўчастка ДАІ. «У нас ёсць цэнтральныя вуліцы, дзе забаронены праезд вялікагрузнага транспарту. Аднак фуры там ходзяць рэгулярна. І разбіваюць нашы дарогі. «Дзякуючы» ім, вуліца Вялікая пасля рамонту пратрымалася толькі 3 гады».

Работы па добраўпарадкаванні горада часам тармозяцца з-за адсутнасці ў ЖКГ неабходнай тэхнікі. Напрыклад, для таго, каб правесці аператыўны ямачны рамонт цэнтральных вуліц, камунальнікам даводзіцца пазычаць тэхніку ў дарожнікаў. Нават той тэхнікі, што ёсць у наяўнасці, сёння не хапае — у мінулым годзе на баланс гарадскіх камунальнікаў былі перададзены інжынерныя сеткі васьмі суседніх сельсаветаў, і частка машын ЖКГ цяпер занятая на работах у вёсках.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ. Новае кафэ «Гасцінец».

АЎТАРЫТЭТ І ПАЎНАМОЦТВЫ

## ГРАМАДСКАЯ «МІСІЯ»

**«Вы ўсю сваю энергію аддалі людзям», — так адазваўся адзін з вяскоўцаў аб старасце Галіне Шалястовіч. «А я сяджу і думаю: не, я не аддала ўсю сваю энергію, яна яшчэ ў мяне засталася», — сказала Галіна Антонаўна на пасяджэнні «круглага стала», якое па просьбе «МС» арганізавалі ў Мастах.**

Сваімі меркаваннямі наконт узаемадзеяння органаў улады раённага і першаснага ўзроўняў са старастамі, а таксама адносна іншых надзённых пытанняў мясцовага самакіравання падзяліліся **старшыня Мастоўскага раённага Савета дэпутатаў Георгій КАРАБКО, старшыня Зарудаўеўскага сельскага Савета дэпутатаў Галіна ДЗЯНІСЕВІЧ, старшыня Азёркаўскага сельскага Савета дэпутатаў Сяргей КАСПЯРОВІЧ, староста вёскі Агароднікі Тамара ВЕРАЦІЛА і староста вёскі Вялікія Азёркі Галіна ШАЛЯСТОВІЧ.**

— На сельскіх сходах, якія прайшлі ў лютым—сакавіку мінулага года, у нашым раёне выбрана 116 старастаў (72 жанчыны і 44 мужчыны), якія з'яўляюцца, можна сказаць, сапраўдным звяном паміж насельніцтвам вёсак і сельвыканкамамі, — лічыць Георгій КАРАБКО. — Яны азнаёмленыя з палажэннем аб старастах, аб парадку маральнага і матэрыяльнага стымулявання іх работы, зацверджаным Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў. Старасты ўдзельнічаюць у пасяджэннях сельвыканкамаў, сесіях сельскіх Саветаў, запрашаюцца на сесіі раённага Савета.

Увага старастаў звычайна накіроўваецца на тыя ўчасткі работы, дзе асабліва патрэбна іх канкрэтная дапамога, дзе яны могуць прымяніць свае сілы, веды і багаты жыццёвы вопыт. Прычым дзейнасць сельскіх старастаў не абмяжоўваецца добраўпарадкаваннем і навядзеннем парадку ў вёсках. Яны дапамагаюць арганізоўваць закупку малака з прыватных падворкаў, праводзіць сельскія сходы, удзельнічаюць у падворных абходах. Да прыкладу, па ініцыятыве старасты вёскі Руда Ліпічанская Галубоўскага сельсавета Вячаслава Іосіфавіча Валчкевіча праведзены капітальны рамонт лазні, адрамантаваныя вулічнае асвятленне і мост цераз рэчку Чарняўку.

Шмат добрых слоў кажуць вяскоўцы і пра старасту вёскі Шасцілы Часлава Станіслававіча Кахновіча. Па яго хадайніцтве правялі добраўпарадкаванне могілак, адрамантавалі агароджу.

На тэрыторыі раёна і, у прыватнасці, Харціцкага сельсавета сталі ўжо традыцыйнымі штогадовыя святы вёсак. І старасты ў гэтым галоўныя арганізатары. За актыўны ўдзел у падрыхтоўцы леташніх святаў у вёсках Русінаўцы і Мазанава старастаў Марыю Мікалаеўну Пронька і Дануту Міхайлаўну Латышаву ўзнагародзілі каштоўнымі падарункамі. А ў Азёркаўскім сельвыканкаме найбольш актыўных старастаў (Галіну Антонаўну Шалястовіч, Лілію Пятроўну Лукашэвіч, Марыю Іванаўну Махамет, Ніну Іванаўну Кавалевіч) узнагародзілі граматамі на агульных сходах жыхароў вёсак. Былі выдзелены і грашовыя сродкі для матэрыяльнага заахвочвання старастаў гэтага сельсавета.

На Мастоўшчыне 24 чалавекі з'яўляюцца нязменнымі старастамі на працягу дзесяці і больш гадоў. Сярод іх — староста вёскі Вялікія Азёркі, работнік культуры з саракагадовым стажам **Галіна ШАЛЯСТОВІЧ**.

— Галіна Антонаўна пастаянна бывае на сесіях сельскага Савета, з'яўляецца членам санітарнай камісіі сельвыканкама, ды і ўвогуле яна ў курсе ўсіх вясковых праблем, — зазначае старшыня Азёркаўскага сельскага Савета дэпутатаў **Сяргей КАСПЯРОВІЧ**. — Прычым, не толькі валодае гэтымі праблемамі, але і рэальна ўплывае на іх вырашэнне. На тэрыторыі нашага сельсавета 11 населеных пунктаў і ўсюды ёсць старасты, якія з'яўляюцца для мяне галоўнымі памочнікамі. І ў арганізацыі сельскіх сходаў, святаў вёсак. І ў складаных жыццёвых сітуацыях. Да прыкладу, калі ў Малых Азёрках згарэла хата, то менавіта старасты не толькі гэтай, але і іншых вёсак нашага сельсавета збіралі грошы для дапамогі пажылой жанчыне, якая засталася без даху над галавой. Людзі давалі, хто колькі мог.

— Перажываю за ўсё, што адбываецца ў вёсцы, — гаворыць Галіна Антонаўна. — Вось сыдзе снег, і мы з Сяргеем Валяр'янавічам пачнём аб'язджаць усе населеныя пункты нашага сельсавета (практыкуем гэта разы тры на год), каб ведаць, ці ўсюды парадак. Спыняемся каля хатаў, па-чалавечы гутарым з жыхарамі, дзе трэба — нешта раім, а камусьці выдаём і адпаведны загад. Хаця ў апошнія гады такія меры даводзіцца выкарыстоўваць нячаста, паколькі парадак каля ўласнага дома і ва ўсёй вёсцы большасць людзей ужо разумее як норму.

Зрэшты, навядзеннем парадку грамадская місія старасты не абмяжоўваецца. Напрыклад, староста невялікай вёсачкі Тумашы Марыя Махамет арганізавала ўшанаванне ажно шасці сямейных параў, якія пражылі па 50 і больш гадоў. А паколькі ўсе старасты на тэрыторыі Азёркаўскага сельсавета цесна кантактуюць паміж сабой, то якое ж свята без баяністкі Галіны Шалястовіч... Арганізавалі выставу дываноў. І «горка!» было.

На сходы ў аддаленыя вёскі разам са старастамі едуць урач, работнікі гандлю, бытавога абслугоўвання. Лечаць, прадаюць. А Галіна Антонаўна з калегамі-культработнікамі ладзяць канцэрт. За дзень вось так аб'язджаюць каля пяці вёсак.

**— А як рэагуюць на вашы звароты ў тых ці іншых службах? Наколькі аператыўна вырашаюцца пытанні, якія ставіць перад імі староста? — цікаўлюся ў Галіны Шалястовіч.**

— Канкрэтны прыклад. Іду па вуліцы, бачу — з калонкі цячэ вада. Напрамую, не нагружаючы гэтым пытаннем старшыню сельвыканкама, тэлефаную ў службу ЖКГ. Назаўтра ж прыехалі і ліквідавалі няспраўнасць. Гэтак жа па-дзелавому, без валакіты, адрэагавалі і на мае звароты па пытаннях рамонту даху ў краме і добраўпарадкавання тэрыторыі пасля пракладвання цеплатрасы. Значыць, у старастаў і сапраўды ёсць паўнамоцтвы і аўтарытэт, да іх прыслухоўваюцца.

З гэтым згодна і староста вёскі Агароднікі **Тамара ВЕРАЦІЛА**, якая працуе ў краме, а па сумяшчальніцтве збірае малако ў насельніцтва. Дарэчы, на тэрыторыі Зарудаўеўскага сельсавета, дзе размешчана 10 населеных пунктаў, на прыватных падворках цяпер 71 карова. А першае месца па здачы малака ад насельніцтва па выніках арганізаванага раённым Саветам дэпутатаў і райвыканкамам спаборніцтва заняў у мінулым годзе Гудзевіцкі сельсавет, дзе ад адной прыватнай каровы ў сярэднім закуплена ажно 4 тоны 547 кілаграмаў малака.

— Без дапамогі з боку старастаў сельвыканкаму, у штаце якога ўсяго тры чалавекі, было б проста не па сілах вырашаць надзённыя пытанні на сваёй тэрыторыі, — лічыць старшыня Зарудаўеўскага сельскага Савета **Галіна ДЗЯНІСЕВІЧ**. — Вось толькі адзін прыклад. Сельвыканкаму было даручана правесці работу з насельніцтвам па заключэнні дагавораў на вываз цвёрдых бытавых адходаў. Мне з двума калегамі ўсіх людзей наведаць было немагчыма. І тут прыйшла на дапамогу малаказборшчыца, староста Тамара Вераціла. Едзе яна па малако, а заадно і прапануе вяскоўцам заключыць адпаведныя дагаворы, якія мы загадзя падрыхтавалі і перадалі ёй.

**— Тамара Мікалаеўна, а якія яшчэ клопаты ў вас як у старасты?**

— У нашай вёсцы пражывае 36 чалавек, і толькі чатыры з іх не пенсіянеры, — адказвае Тамара Вераціла. — Стараюся выканаць любую просьбу аднавяскоўцаў, нават калі прыходзяць уначы. І крывяны ціск даводзіцца мераць, і «хуткую дапамогу» выклікаць.

Пацікавіўся ў субяседнікаў іх меркаваннямі наконт так званых цяжкіх сем'яў, а таксама пажараў па ўжо традыцыйнай схеме — выпіў, закурыў у ложку і — пажар, смерць.

— Мы пайшлі па такім шляху, — расказвае Галіна Дзянісевіч. — Прыходзім у «групу рызыкі» (на нашай тэрыторыі 26 чалавек на ўліку ў нарколагаў), раздаём памяткі па правілах пажарнай бяспекі пад роспіс, заводзім на гэтых людзей карткі, дзе пазначаем заўвагі. Потым зноў наведваем іх і правяраем, якія высновы зроблены. Але гэтага мала. На мой погляд, недапрацоўваюць тут работнікі МНС. Прыйшлі — напішыце загад, дайце тэрмін на ліквідацыю выяўленых парушэнняў. А праз месяц—паўтара праверце, што зроблена. Думаю, будзе вынік.

— У кожным «цяжкім» выпадку трэба рабіць усё магчымае, каб канкрэтная сітуацыя змянілася да лепшага, — лічыць Сяргей Каспяровіч. — Ёсць у нас сям'я, дзе дзеці пакутавалі ад п'янства сваіх бацькоў. Заняліся ёй — накіравалі бацьку на лячэнне ад алкагалізму, паўплывалі на маці. Пакуль, дзякуй Богу, становішча ў гэтай сям'і нармальнае. Так што грамадскасць — вялікая сіла.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*Мастоўскі раён.*

ТЭМА ДНЯ

## САЦЫЯЛЬНЫМ ЖЫЛЛЁМ СПЕЦЫЯЛІСТА НЕ ПРЫВАБІШ

### Чаму маладыя медыкі не затрымліваюцца ў «глыбінцы»?

**На мінулым тыдні дэпутаты Мінскага абласнога Савета на чарговай сесіі абмеркавалі выкананне Праграмы развіцця аховы здароўя Мінскай вобласці, разлічанай на 2007—2010 гады.**

Мяркуючы па ажыўленых дэбатах, якія пачаліся ў зале пасяджэнняў і прадоўжыліся падчас перапынку ў «кулуарах», узнятая тэма не пакінула раўнадушнымі ні саміх дэпутатаў аблсавета, ні запрошаных на сесію старшыняў раённых Саветаў, ні галоўных урачоў цэнтральных раённых медустаноў. У ходзе работы акрэсліліся і асноўныя праблемы, якія ў той ці іншай ступені датычацца кожнага раёна.

Удасканальванне медыцынскага абслугоўвання — тэма, якая заўсёды на вастрыі. Яна хвалюе кожнага з нас, незалежна ад статусу і ўзросту, таму што ўсім хочацца быць здаровымі і жыць у нармальным, здаровым асяродку. Ад гэтага, уласна кажучы, і адштурхоўваюцца ўсе медыцынскія праграмы, у тым ліку і Праграма развіцця аховы здароўя Мінскай вобласці.

На фінансаванне патрэбаў медыцыны вобласці ў мінулым годзе было накіравана 567 млрд рублёў (у тым ліку больш за 15 млрд — на будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў аховы здароўя). Мінскі абласны Савет дэпутатаў вызначыў надбаўкі да заработнай платы кардыёлагам, урачам функцыянальнай і ультрагукавой дыягностыкі, а таксама медыцынскім работнікам медустаноў, размешчаных у межах горада Мінска. Паводле слоў **начальніка ўпраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама Івана ЛІПНІЦКАГА**, гэта дазволіла ўмацаваць кардыялагічную службу і прыпыніць адток адпаведных медыцынскіх кадраў з абласных устаноў аховы здароўя.

Вядзецца работа і па ўдасканаленні стацыянаразамяшчальных тэхналогій — стацыянарнае лячэнне ў медустановах усё часцей саступае месца дзённаму знаходжанню.

— Дзённыя стацыянары — запатрабаваная і эканамічна выгадная форма меддапамогі, тым больш актуальная ў цяперашняй эканамічнай сітуацыі, — падкрэсліў Іван Ліпніцкі.

У сувязі з гэтым упор сёння робіцца не на пашырэнне штатнага раскладу і павелічэнне колькасці ложка-месцаў, а на ўкараненне высокіх медыцынскіх тэхналогій, закупку сучаснага абсталявання і падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў.

Аднак з кадрамі якраз і ўзнікае праблема. Па шэрагу раёнаў па-ранейшаму не выконваецца нарматыў забяспечанасці ўрачамі першаснага звяна.

Работа па замацаванні кадраў на месцах хоць і вядзецца, але гэтага відавочна недастаткова пры той сітуацыі, якая склалася. Практычна ва ўсіх раёнах вобласці (за выключэннем Бярэзінскага, Валожынскага, Мінскага і Слуцкага) колькасць урачоў, якія звольніліся на працягу года, перавысіла колькасць прынятых на працу. У Крупскім раёне было прынята 3 спецыялісты, звольнілася 7; у Мядзельскім прынята 5, звольнілася 9; у Смалявіцкім і Уздзенскім уладкавалася на працу па 5 урачоў, затое звольнілася па 8; у Салігорскія медустановы прыйшло 34 спецыялісты, а развіталіся з тымі ж установамі 41; у Маладзечанскім раёне 26 чалавек прыступілі да працы, а 35 пакінулі свае працоўныя месцы... У агульным і цэлым у 2008 годзе ўладкаваліся на працу ў медыцынскія ўстановы вобласці 418 урачоў, а звольніліся 421.

— У тым ліку з устаноў аховы здароўя вобласці звольніліся 84 маладыя спецыялісты. І мы не здолелі іх затрымаць, — канстатаваў Іван Ліпніцкі. — Калі падыходы да замацавання кадраў на месцах не зменяцца, мы і далей будзем мець тут адмоўны баланс.

«Паглынае» маладых спецыялістаў сталіца. Сёння горад Мінск, дзе таксама не хапае медыкаў, гатовы даць апошнім і жыллё, і рэгістрацыю па месцы жыхарства.

— Ад галоўных урачоў я патрабую тлумачальныя за кожнага маладога спецыяліста, які звальняецца. Хоць ведаю: большасць маладых не заваьіш у раён ні жыллём, ні зарплатай, ні магчымасцю кар'ернага росту. Пры любым раскладзе сталіца прываблівае іх больш, — гаворыць Іван Ліпніцкі.

Для вырашэння кадравай праблемы і забеспячэння шэрагу медыцынскіх арганізацый неабходнымі спецыялістамі кіраўніцтва аблвыканкама прапанавала райвыканкамам правесці работу па заключэнні дагавораў са студэнтамі медуніверсітэтаў, якія вучацца на платнай аснове. З мэтай пераходу апошніх на аплату за кошт сродкаў райвыканкамаў. Інакш кажучы, райвыканкам бярэ на сябе абавязак аплаціць навучанне «свайго» студэнта. А той, атрымаўшы дыплом, павінен прыехаць у гэты раён і адпрацаваць там не менш за 5 гадоў. Сёння такія дагаворы заключаны з 35 студэнтамі медыцынскіх ВНУ, яшчэ з 20 патэнцыйнымі спецыялістамі вядзецца работа.

— Што б мы з вамі ні рабілі, скажам, у Крупскім раёне, якія б меры там ні прымалі па замацаванні маладых спецыялістаў, мінчане туды працаваць не паедуць, — звярнуўся да прысутных **першы намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Віктар ШЧЭЦЬКА**. — Калі мы не пойдзем па такім шляху, па якім пайшла Гомельская вобласць, і не падрыхтуем свайго ўласнага спецыяліста — не забяром яго з таго ж Крупскага раёна, не ўладкуем ва ўніверсітэт, не выдзелім грошы на навучанне — то нічога і не будзе. Так што не сядзіце і не чакайце — звяртайцеся ў ВНУ, дамаўляйцеся са студэнтамі 3—4 курсаў. Бо самастойна да вас яны не паедуць. У адваротным выпадку дачакаецеся, што будзе яшчэ горш. Гэта недапушчальная сітуацыя — калі на працу ўладкоўваецца, скажам, 25 спецыялістаў-медыкаў, а звальняецца 40. Значыць, галоўны ўрач там не на месцы. Ды і кватэры ў старых дамах, якія засталіся пасля перасялення ранейшых жыхароў, не прываблiваюць моладзь. Трэба даваць маладым не сацыяльнае жыллё, а крэдыты па лініі жыллёва-будаўнічых кааператываў.

Пакуль не зніжаецца ў вобласці і паказчык агульнай смяротнасці. Рост колькасці памерлых зарэгістраваны ў 12 раёнах. (Найбольш высокі ўзровень смяротнасці — у Клецкім, Валожынскім, Капыльскім і Мядзельскім раёнах.) У тым ліку на 6,5 працэнта павялічылася смяротнасць ад захворванняў органаў стрававання. Сумны «прырост» далі захворванні печані і падстраўнікавай залозы, якія з'явіліся вынікам злоўжывання алкаголем. Выступоўцы неаднаразова падкрэслівалі, што праблема распаўсюджвання п'янства і алкагалізму застаецца адной з самых злабадзённых і сацыяльна небяспечных. Агульная колькасць асобаў, якія знаходзяцца сёння на наркалагічным уліку ў Мінскай вобласці, за 5 гадоў вырасла ў 2 разы і складае на 1 студзеня гэтага года амаль 45 тысяч чалавек.

Разам з тым, у 5 раёнах (Дзяржынскім, Клецкім, Капыльскім, Смалявіцкім, Старадарожскім) на пасадах урачоў-нарколагаў працуюць сумяшчальнікі. А ў Крупках, Мядзелі і Пухавічах увогуле адсутнічаюць такія спецыялісты.

Дэпутаты аблсавета выказалі сур'ёзную заклапочанасць тым, што ў мінулым годзе практычна па ўсіх групах алкагольнай прадукцыі тэмпы росту продажу склалі ад 110 да 142 працэнтаў. У асобных раёнах удзельная вага алкаголю ў харчовым тавараабароце займае да 30 працэнтаў. Такім чынам, на фоне высокай даступнасці алкагольнай прадукцыі (адносна нізкай цаны і вялікай колькасці месцаў продажу) эфектыўнасць барацьбы разнастайных службаў і ведамстваў за здаровы лад жыцця рэзка зніжаецца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

# ТВОЙ ПРАДСТАЎНІК У САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ

***ЕРМАКОВА***
***Надзея Андрэеўна***

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце фінансах**



Нарадзілася 19 красавіка 1953 года ў в. Разульмоў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава.

З 1996 года — старшыня Праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк». Член Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь. Ганаровы работнік банкаўскай сістэмы Беларусі.

Узнагароджана ордэнам Пашаны.

***КІСЯЛЁЎ***
***Уладзімір Аляксеевіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах**



Нарадзіўся 2 красавіка 1958 года ў в. Харкаўка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2001 года — генеральны дырэктар вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі цэментны завод».

Дэпутат Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

***КАРАЕД***
***Алена Аляксандраўна***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці**



Нарадзілася 6 чэрвеня 1966 года ў г. Мсціслаў Магілёўскай вобласці. Закончыла Смаленскі дзяржаўны медыцынскі інстытут.

З 2008 года — галоўны ўрач установы аховы здароўя «Мсціслаўская цэнтральная раённая бальніца».

Дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

***МАІСЕЕЎ***
***Леанід Сяргеевіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**



Нарадзіўся 23 красавіка 1950 года ў в. Міхайлавічы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

З 1987 года — старшыня калгаса «Зара». З 2003 года — дырэктар, генеральны дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна.

Дэпутат Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў і Княжыцкага сельскага Савета дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыны III ступені, Айчыны II ступені.

***НАВІЦКІ***
***Генадзь Васільевіч***

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**



Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў г. Магілёве. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

З 2003 года — Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў. З 2008 года — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.

Член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў).

## МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ




***РАІНЧЫК***
***Ірына Анатольеўна***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве**



Нарадзілася 16 красавіка 1973 года ў г. Магілёве. Закончыла дашкольны факультэт і факультэт практычнай псіхалогіі Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2000 года — загадчык санаторных ясляў-садка № 36 аддзела адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Магілёва.

Член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

***РУДНІК***
***Пётр Міхайлавіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**



Нарадзіўся 14 красавіка 1957 года ў в. Аляксееўка Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Дрэздэнскі тэхнічны ўніверсітэт, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Са снежня 2008 года — старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

***УЦЮПІН***
***Павел Уладзіміравіч***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянал па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**



Нарадзіўся 17 снежня 1976 года ў с. Папоўка Харольскага раёна Прыморскага краю. Закончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

З 2006 года — намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах адкрытага акцыянернага таварыства «Белшына».

# ДАТАЦЫІ НЕ ПРАДУГЛЕДЖАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У горадзе ёсць раёны індывідуальнай забудовы, дзе вуліцы ўвогуле не здадзены на абслугоўванне ЖКГ, бо там яшчэ адсутнічаюць інжынерныя сеткі. Людзі даўно пабудавалі катэджы і хочуць мець нармальную пад'язную дарогу. Але на ўсё гэта патрэбны значныя фінансавыя сродкі.

Асобнай размовы заслугоўвае раён індывідуальнай забудовы Хмелеўка. Заслаўю ён быў перададзены 1 сакавіка 2007 года рашэннем сесіі Мінскага абласнога Савета. «У куль няма аб'ектаў сацыяльнай сферы, — працягвае Ніна Бухавец. — Праз аўкцыён мы перадалі ўчастак у арэнду для будаўніцтва крамы. Ужо вядуцца праектныя работы. З абласнога дарожнага фонду былі выдаткаваны грошы на асфальтаванне дарогі, каб туды мог заходзіць гарадскі аўтобус. Работы яшчэ да канца не даведзены (няма нармальнага прыпыначнага пункту, трэба дарабіць тратуар). Аднак, думаю, у гэтым годзе ў раён індывідуальнай забудовы «Хмелеўка» пачне хадзіць аўтобус.

Адкрытым застаецца пытанне



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Хмелеўцы ўвогуле няма добраўпарадкаваных дарог і нармальных інжынерных камунікацый (не на ўсіх вуліцах ёсць водаправод, газ, электрычнасць), ніякай адпаведнай дакументацыі на гэтыя сеткі камунальнікам і Заслаўскаму РЭСу да гэтага часу ніхто так і не перадаў, — апісвае сітуацыю Ніна Пятроўна. — У свой час у Хмелеўцы ўчасткі для будаўніцтва жылля выдзялялі Мінскі гарвыканкам, Мінскі райвыканкам і Пятрышкаўскі сельвыканкам. А цяпер усе землі перадалі нашаму гораду. Па нашым хадайніцтве УКБ Мінскага райвыканкама распрацавала праектна-каштарыскую дакументацыю на электразабеспячэнне адной часткі раёна Хмелеўка (сёння гэты праект ужо рэалізуецца). Магчыма, пазней з'явіцца і праект другой часткі раёна. Нявырашанай праблемай застаецца падвядзенне каналізацыі Хмелеўкі да агульназаслаўскай сеткі. Пэўныя работы некалі былі распачаты, але потым цалкам спыніліся».

Акрамя галаўнога болю (у першую чаргу па пытаннях добраўпарадкавання), Хмелеўка прынесла гораду і значную карысць: 65 зямельных участкаў былі перададзены жыхарам горада для паляпшэння жыллёвых умоў. Свабодныя ўчасткі былі выстаўлены на аўкцыёны і прынеслі ў казну салідны прыбытак.

— На тэрыторыі Хмелеўкі пабудаўніцтва ў Заслаўі станцыі абезжалезвання вады. У праграму «Чыстая вада» горад не ўвайшоў, хаця ўзровень утрымання жалеза тут значна перавышае дапушчальную норму. Зараз ЖКГ рыхтуе абгрунтаванне для ўключэння горада ў новую абласную профільную праграму.

У межах праграмы развіцця малых і сярэдніх гарадоў у Заслаўі рэалізуецца некалькі інвестыцыйных праектаў, самы значны з якіх — рэканструкцыя грабнога канала Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па водных відах спорту. Там прадугледжана зона адпачынку, басейны, летні амфітэатр, гасцініцы. Гэта будзе ўнікальны аб'ект, які павінен прыцягнуць у Заслаўе яшчэ больш турыстаў.

— Пра добраўпарадкаванне можна гаварыць доўга, — падвяла вынікі нашай размовы Ніна Пятроўна. — Можна бясконца крытыкаваць работу камунальных і іншых службаў, якія адказваюць за знешні выгляд нашага горада. Аднак мне б хацела падкрэсліць, што чысціня вакол нас залежыць ад нас саміх. Зрабіць горад добраўпарадкаваным і прыгожым мы зможам толькі пры актыўнай падтрымцы нашых гараджан. Надышоў час адмовіцца ад пазіцыі пасіўных назіральнікаў.

**Інга МІНДАЛЁВА.**
*г. Заслаўе.*

# НЕ ВЫХОДЗІЦЬ ЗА ПЕРШАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ

**У органы мясцовай улады Гомельскай вобласці летась паступіла больш за 58 тысяч пісьмовых зваротаў грамадзян. Гэта на 45 працэнтаў меньш, чым у 2007 годзе. Непасрэдна ў Гомельскі аблвыканкам паступіла 3318 зваротаў, або на 21 працэнт менш. Найбольш заўважна знізілася лічба зваротаў і скаргаў, якія тычацца будаўніцтва і жыллёвай палітыкі, а таксама пытанняў дзейнасці падраздзяленняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

З аднаго боку, гэта сведчыць аб паспяховай рэалізацыі ў вобласці, як і ў рэспубліцы ў цэлым, дзяржаўнай праграмы жыллёвага будаўніцтва. Так, колькасць пабудаванага жылля ў рэгіёне за апошнія тры гады вырасла на 65 працэнтаў, значныя сродкі ўкладзены ў капітальны рамонт жылога фонду. З другога боку, якасна палепшылася работа са зваротамі грамадзян на месцах. Чыноўнікі сталі больш даступнымі, таму многія пытанні вырашаюцца ў рабочым парадку. Разам з тым, ёсць недахопы. Напрыклад, летась за недагляд у рабоце са зваротамі грамадзян было пакарана 180 службовых асобаў, у тым ліку адзін са старшынь райвыканкама.

— Калі мы бачым, што сапраўды хтосьці падтрымлівае свой ведамасны інтарэс, а не думае аб дзяржаўным, тады пад крытыку трапляюць і старшыні райвыканкамаў, і іншыя адказныя асобы, — гаворыць намеснік начальніка кіравання справамі — **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і прававым забеспячэнні Гомельскага аблвыканкама Віталь УТКІН**.

Сёння грамадзянін не павінен быць просьбітам у чыноўніка, чалавеку трэба аддаваць больш увагі. Дырэктыва № 2, зноў жа, гаворыць аб тым, што, калі пытанне складанае — ёсць прабел у заканадаўстве або незразумела, як яго дакладна інтэрпрэтаваць — праблема аднназначна павінна вырашацца на карысць грамадзяніна. На жаль, працэсы дэмакратызацыі, якія ідуць у нашай дзяржаве, асобныя грамадзяне ўспрымаюць як усёдазволенасць. Іх не цікавіць, што ў гэтай сітуацыі парушаюцца правы іншых грамадзян. Ёсць пэўная катэгорыя людзей, якія імкнуцца выкарыстоўваць закон аб зваротах грамадзян у сваіх карысных мэтах. Сёння ўсе кіраўнікі сталі абсалютна даступныя для ўсіх катэгорый людзей. Некаторыя грамадзяне прыходзяць па 5-6 разоў і займаюцца псіхалагічным тэрорам. У пэўнай часткі з тых, хто прыходзіць пастаянна, ёсць жаданне скінуць на чыноўніка свой эмацыйны стрэс. Ёсць такая катэгорыя агульнапрызнаных «герояў», якіх цікавіць любая сацыяльная праблема, і за кошт яе вырашэння ў сваім раёне, двары яны спрабуюць «напрацаваць» сабе пэўны імідж. Улада сёння ведае праблемы грамадзян, але ж тут аднымі амбіцыямі не абыдзешся.

Аднак у нас хапае сілы, волі, цярпення выслухоўваць такіх людзей і не паддавацца на «правакацыю».

**— Наша насельніцтва добра памятае і савецкі час, і той сацыяльны пакет, які існаваў раней...**

— У рэспубліцы Беларусь сёння ён меншы. Але ж шэраг грамадзян, выкарыстоўваючы ў тым ліку і чарнобыльскую тэматыку, жадаюць вырашыць свае праблемы так, як было раней. У нас ёсць прыклад, калі чалавека перасялілі з чарнобыльскай зоны, ён выкарыстаў сваё права, а потым кінуў дом і патрабуе, каб яго па-новаму перасялялі, але ж абавязкова ў Гомель. Як ні дзіўна, але ёсць людзі, якія праз 60 гадоў спрабуюць атрымаць льготы ветэранаў Вялікай Айчыннай. Зараз практычна не засталося сведкаў, звесткі з архіваў супярэчлівыя... Але ж чалавек абвінавачвае адказную асобу, што не дапамагла яму. Ёсць і такія, якія не плацяць за «камуналку» і кажуць, што ЖКГ аказвае няякасныя паслугі. Пры гэтым суседзі па пляцоўцы нараканняў не маюць.

**— Ёсць магчымасць прыпыніць перапіску з чалавекам, калі яна безвыніковая?**

— Заканадаўствам прадугледжаны артыкул аб прыпыненні перапіскі, але на практыцы ён не працуе. Калі мы прыпыняем перапіску на сваім узроўні, аўтаматычна чалавек пачынае звяртацца ў вышэйстаячы орган. У сталіцы яго зварот рэгіструюць, вяртаюць нам, і мы зноў разглядаем. І атрымліваецца, што мы аўтаматычна самі сабе ствараем праблему росту зваротаў грамадзян як у вышэйстаячыя органы, так і да нас. З такой катэгорыяй грамадзян вельмі складана. Сёння нават прадугледжваецца спагнанне з іх матэрыяльных выдаткаў, але як іх падлічыць? І гэта трэба рабіць у судовым парадку. Можа, калі б людзі ўносілі нейкую нязначную плату за падачу зваротаў, такіх скаргаў стала б менш.

**— Многія арганізацыі рэгулярна атрымліваюць скаргі ад псіхічна хворых людзей. Ці абавязкова ім адказваць?**

— Сёння заканадаўства не дазваляе ім не адказваць. Усё адно мы павінны напісаць: паважаны, ваш зварот разгледжаны. І адказ яму трэба даваць. Нават у выпадку, калі вырашэнне праблемы знаходзіцца не ў нашай кампетэнцыі, адказ павінен быць.

**— Вы можаце прывесці канкрэтныя прыклады дапамогі людзям пасля іх зваротаў да органаў улады?**

— За мінулы год толькі з боку абласнога выканаўчага камітэта пяцістам грамадзянам аказана рэальная дапамога або выдзелены пэўныя матэрыяльныя сродкі. Менавіта пасля зваротаў грамадзян, напрыклад, выкананы капітальны рамонт дома па праспекце Касманаўтаў у Гомелі, работы па газіфікацыі 9 жылых дамоў у населеным пункце Рассвет Добрушскага раёна, прыняты меры па ліквідацыі вільготнасці ў некаторых кватэрах у абласным цэнтры і гэтак далей...

**— І ўсё ж, якія тэмы ў зваротах самыя «папулярныя»?**

— Як звычайна, праблемы жыллёва-камунальныя. Людзі больш за ўсё сутыкаюцца з імі ў штодзённым жыцці. Медыцынская тэматыка таксама актуальная. Нягледзячы на тое, што ў нас невялікая колькасць скаргаў па гандлі, сказаць, што ў гэтай галіне ўсё добра, таксама нельга. Проста людзі больш звяртаюць увагу на адно, менш — на іншае. Казаць, што ўлада павінна паставіць на кожным працоўным месцы кантралёра — гэта таксама няправільна. Але калі сапраўды існуе праблема, яе трэба імкнуцца вырашаць на першасным узроўні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# САЦЫЯЛЬНЫМ ЖЫЛЛЁМ СПЕЦЫЯЛІСТА НЕ ПРЫВАБІШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— На сённяшні дзень гэта адна з найбольш вострых праблем, — падкрэсліў **памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай ІВАНЧАНКА**. — Гэту праблему называюць, але не заастраюць. Чаму мы не гаворым ва ўвесь голас, выкарыстоўваючы дэпутацкі корпус, аб тым, што выкананне праграмы па барацьбе з алкаголем у краіне часцяком ігнаруецца — як у частцы яго ўжывання, так і ў частцы продажу, у частцы працягвання выпуску пладова-ягадных вінаў, якія прыводзяць да хуткай алкагалізацыі? Чаму не паставіць гэту праблему перад абласным гандлем, перад прамысловасцю?

У Мінскай вобласці работа па прафілактыцы п'янства і алкагалізму, асабліва ў сем'ях, узятая пад асабісты кантроль дэпутацкага корпусу. Пытанне падрабязна вывучалася на адной з апошніх сесій абласнога Савета з удзелам упраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама. Разглядалі яго і падчас Дня дэпутата, неаднойчы ўзнімалі на рэгіянальных сходах — у прысутнасці дэпутатаў сельскіх Саветаў, старэйшын вёсак, участковых.

— Мы ніколі не замоўчвалі гэту праблему — наадварот, заўсёды гаварылі ўголас пра ўсе «болевыя кропкі», — звярнулася да прысутных **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**. — Акрамя таго, мы ўжо разгледзелі і аддалі ў Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі свае прапановы па гэтым пытанні. У шэрагу рэгіёнаў на сесіях былі прыняты рашэнні аб забароне ўжывання спіртных напояў (у тым ліку піва) у грамадскіх месцах. Іншая рэч — сёння ўсе гэтыя меры не даюць таго выніку, які павінен быць і якога ўсе мы чакаем. Таму яшчэ раз звяртаюся да дэпутатаў, старшыняў райсаветаў і галоўных урачоў: засяродзьце сваю ўвагу на прафілактыцы! Паглядзіце, чым займаюцца ў вячэрні час нашы дзеці — на дыскатэках, у дамах культуры. Асабліва ў сельскай мясцовасці. Калі мы пакінем моладзь без увагі, то прапусцім момант, і потым зноў давядзецца змагацца з наступствамі.

— Адзін са спосабаў барацьбы з п'янствам і алкагалізмам, які мы пачалі ўкараняць, — забарона продажу спіртных напояў пасля 21.00. Думаю, у хуткім часе гэта адчуюць усе раёны, калі яшчэ не адчулі, — паабяцаў Віктар Шчэцька. — Да 24.00 спіртным будуць гандляваць толькі рэстараны і кавярні. Гаварыць аб эфектыўнасці гэтай меры пакуль яшчэ рана, час пакажа, ці мелі мы рацыю. Ва ўсякім разе, нейкія захады рабіць трэба. Не забываючы пры гэтым, што паралельна тут закранаюцца пытанні вялікай эканомікі: толькі за мінулы год ад продажу спіртнога на тэрыторыі Мінскай вобласці дзяржаўная казна атрымала 680 млрд рублёў. Так што ўзяць і адным махам усё забараніць мы не можам. Ды і не вырашыш праблему забаронамі. Трэба думаць аб выхаванні культуры піцця.

На сесіі было адзначана, што па выніках 2008 года Мінская вобласць заняла другое месца ў Рэспубліканскім аглядзе якасці і культуры медыцынскага абслугоўвання насельніцтва сярод адміністрацыйных тэрыторый. Што само па сабе сведчыць аб належным узроўні падрыхтоўкі спецыялістаў і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы шэрагу медустаноў.

— Аднак і рэзерваў для ўдасканалення яшчэ хапае, — падкрэсліў Віктар Шчэцька. — Сёлета нам трэба папрацаваць так, каб выйсці на першае месца.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# ВОСЬ ТАКОЕ МАЛАКО...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Па 600 рублёў за літр здаюць сваю прадукцыю і вяскоўцы Брэсцкага раёна. Знакаміты «Савушкін прадукт» вызначыў такую цану адразу пасля выхаду дакумента. Як расказаў **старшыня Знаменскага сельскага Савета Сяргей ГАЛАВЕНКА**, у Знаменцы, якая размешчана за 25 кіламетраў ад Брэста, адразу з'явіліся перакупшчыкі. Яны прапануюць людзям сваю цану, а затым вязуць малако на рынак. Прыватны статак сельсавета складаецца з 181 каровы. Пакуль яшчэ ў дзень на прыёмныя пункты паступае каля адной тоны малака. Але гаспадары вельмі не задаволены сітуацыяй з цаной. Прадпрыемству-манапалісту, падобна на тое, сялянскае малако наогул не патрэбнае, у яго хапае сыравіны.

У Камянецкім раёне сітуацыя наогул склалася дваякая, бо вяскоўцы здаюць сваю прадукцыю на два прадпрыемствы. Дык вось Высокаўскае ААТ «Белавежскія сыры» цану не мяняла, і плаціць па 665 рублёў за літр. Туды прывозяць малако з Вярховіцкага, Воўчынскага, Дзмітровіцкага, Расненскага, Камянюкскага сельсаветаў. А жыхары Відамлянскага, Пелішчанскага, Навіцкавіцкага сельсаветаў здаюць малако ў «Савушкін прадукт» і атрымліваюць па 600 рублёў.

Як паведамілі ў Брэсцкім абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні, хочаш — не хочаш, але малакаперапрацоўчым прадпрыемствам давядзецца вярнуцца да ранейшай цаны. У канцэрн «Брэстмясамалпрам», а таксама кіраўнікам раёнаў яшчэ 10 сакавіка быў накіраваны ліст аблвыканкама, у якім запатрабавана ад прадпрыемстваў «у мэтах недапушчэння зніжэння даходаў насельніцтва праводзіць аплату за здадзенае малако па закупачных цэнах, не ніжэйшых за тыя, якія дзейнічалі да 9 лютага гэтага года». А тым, хто паспяшаўся памяняць цэны ў бок змяншэння, загадана зрабіць пераразлік за здадзеную прадукцыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# БРЫГАДА ВЫСЕКЛА 131 ДРЭВА

**Супрацоўнікамі Смаргонскай міжрайінспекцыі сумесна з работнікам Смаргонскага доследнага лясгаса ў прыдарожнай паласе аўтадарогі Болтуп—Бернікі была выяўлена брыгада рабочых ДРБУ, якая высякала тут расліннасць без афармлення і выпіскі неабходных дакументаў.**

У выніку незаконных дзеянняў было ссечана 131 дрэва. У дачыненні да майстра складзены адміністрацыйны пратакол. На адрас юрыдычнай асобы рыхтуецца прэтэнзія і іск за нанесены прыродным рэсурсам урон.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДОБРЫХ ЯЕК ШМАТ НЕ БЫВАЕ

**Антыкрызісная эканоміка**

**Птушкафабрыкі Баранавіцкага раёна — лепшыя ў аб'яднанні «Белптушкапрам». «Дружба» лідзіруе ў мясным кірунку, а ў Баранавіцкай птушкафабрыкі найлепшыя паказчыкі ў вытворчасці яек.**

Першая не мае роўных сярод аналагічных прадпрыемстваў у сваёй галіне. За мінулы год птушкафабрыка адправіла на экспарт мяса на 5,5 млн долараў. На Баранавіцкай фабрыцы вытворчасць яек вырасла на 18 працэнтаў, іх экспарт павялічыўся ў паўтара раза. Праўда, на рэканструкцыю фабрыкі было выдаткавана 30 мільярдаў рублёў, але і аддача відавочная.

Прадукцыя птушкафабрык пастаўляецца галоўным чынам у Расію, і там наша прадукцыя вытрымлівае канкурэнцыю, але дырэктар Баранавіцкай птушкафабрыкі Яўген Хілько спадзяецца, што неўзабаве ўдасца ўступіць у Агульнаеўрапейскую арганізацыю вытворцаў яек і тады прадукцыю птушкафабрыкі пакаштуюць і ў Еўропе.

Далучэнне да птушкафабрык занепалых сельгаскааператываў дало станоўчыя вынікі. У гаспадаркі былі ўкладзены вялікія грошы, і гэта вярнулася высокімі ўраджаямі і надоямі.

Кіраўнікі прадпрыемстваў лічаць, што для дасягнення аптымальных вынікаў птушкафабрыкі павінны мець усё сваё: зямлю, збожжа, камбікормавыя заводы, крамы. Такая самазабяспечанасць дасць магчымасць выжыць прадпрыемствам у крызісных умовах — прадукцыя птушкафабрык заўсёды запатрабаваная.

А вось прамысловасць раёна пачала прабуксоўваць, і па выніках работы за два месяцы 2009 г. не выйшла па паказчыках на ўзровень аналагічнага перыяду мінулага года. Да прыкладу, СП «Дыпрыз» доўгі час працавала паспяхова, і выпускаемая прадпрыемствам мэбля пастаўлялася на заходнія рынкі, якія сёння рэзка скараціліся. Таму даводзіцца браць кірунак на ўсход і весці барацьбу за спажыўца на розных выставах у Расіі.

Ёсць пэўныя праблемы на гравійна-сартавальным заводзе «Амнеўічы» і прадпрыемстве па вытворчасці торфу «Калпеніца». Стратэгія выжывання сёння выразна акрэсленая: эканомія выдаткаў, высокая якасць прадукцыі. Адсюль — паспяховы экспарт, які дае грошы на новае развіццё. Тактыку кожны выбірае сам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Организация:

## ОАО «СЛУЦКИЙ САХАРОРАФИНАДНЫЙ КОМБИНАТ»

**Вид деятельности:** производство сахара
**Организационно-правовая форма:** частная
**Орган управления:** КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»
**Единица измерения:** млн. рублей
**Адрес:** Минская обл., г. Слуцк, ул. Головащенко, 6.

### ОТЧЕТ за 2008 год

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость (01) | 101 | 173326 | 226238 |
| амортизация (02) | 102 | 96812 | 113585 |
| остаточная стоимость | 110 | 76514 | 112653 |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость (04) | 111 | 27 | 24 |
| амортизация (05) | 112 | 15 | 16 |
| остаточная стоимость | 120 | 12 | 8 |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость (03) | 121 | 9318 | 8367 |
| амортизация (02) | 122 | 4521 | 4909 |
| остаточная стоимость | 130 | 4797 | 3458 |
| Вложения во внеоборотные активы (07,08) | 140 | 19855 | 6874 |
| в том числе: незавершенное строительство (08) | 141 | 9491 | 3370 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 101178 | 122993 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 119779 | 145077 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы (10, 15, 16) | 211 | 19352 | 31703 |
| животные на выращивании и откорме (11) | 212 | | |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты (20, 21, 23, 29) | 213 | 316 | 444 |
| расходы на реализацию (44) | 214 | 1176 | 948 |
| готовая продукция и товары для реализации (40, 41, 43, 44) | 215 | 64664 | 87357 |
| товары отгруженные (45) | 216 | 31720 | 22860 |
| выполненные этапы по незавершенным работам (46) | 217 | | |
| расходы будущих периодов (97) | 218 | 2551 | 1765 |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам (18, 76) | 220 | 1409 | 467 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | 186 | 541 |
| в том числе: покупателей и заказчиков (62) | 231 | | |
| прочая дебиторская задолженность (60, 76) | 232 | 186 | 541 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 7913 | 11352 |
| в том числе: покупателей и заказчиков (62) | 241 | | 1 |
| поставщиков и подрядчиков (60) | 242 | 4133 | 3655 |
| по налогам и сборам (68, 69) | 243 | 3386 | 7293 |
| по расчетам с персоналом (70, 71, 73) | 244 | 22 | 27 |
| разных дебиторов (76) | 245 | 372 | 376 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | |
| Расчеты с учредителями (75) | 250 | | |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд (75) | 251 | | |
| прочие (75) | 252 | | |
| Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57) | 260 | 1620 | 18685 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах (55) | 261 | 1000 | 649 |
| денежные средства на валютных счетах (52) | 262 | 303 | 11318 |
| Финансовые вложения (58) | 270 | 467 | 3119 |
| Прочие оборотные активы (79, 94) | 280 | 6 | 7 |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 131180 | 179248 |
| **БАЛАНС (190+290)** | 300 | 232558 | 302241 |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд (80) | 410 | 118 | 48863 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81) | 411 | | |
| Резервный фонд (82) | 420 | 957 | 957 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 957 | 957 |
| Добавочный фонд (83) | 430 | 103261 | 92620 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99) | 440 | **X** | **X** |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) (84) | 450 | 14499 | 15339 |
| Целевое финансирование (86) | 460 | | |
| Доходы будущих периодов (98) | 470 | 9 | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 118844 | 157779 |
| **IV. Долгосрочные ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы (67) | 510 | 26064 | 11566 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 26064 | 11566 |
| **V. Краткосрочные ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы (66) | 610 | 43826 | 63958 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 43760 | 68687 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками (60) | 621 | 41167 | 64931 |
| перед покупателями и заказчиками (62) | 622 | 562 | 1190 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда (70) | 623 | 484 | 819 |
| по прочим расчетам с персоналом (71, 73) | 624 | | |
| по налогам и сборам (68) | 625 | 1233 | 570 |
| по социальному страхованию и обеспечению (69) | 626 | 186 | 334 |
| по лизинговым платежам (76) | 627 | | |
| перед прочими кредиторами | 628 | 128 | 843 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) (75) | 630 | 52 | 251 |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | 52 | 251 |
| прочая задолженность | 632 | | |
| Резервы предстоящих расходов (96) | 640 | 12 | |
| Прочие краткосрочные обязательства (79) | 650 | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 87650 | 132896 |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | 700 | 232558 | 302241 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2008 г. по 31 декабрь 2008 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 297274 | 256516 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 41138 | 26531 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 256136 | 229985 |
| СПРАВОЧНО (из строки 010): Сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 212620 | 208617 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 43516 | 21368 |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | 9020 | 7905 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 34496 | 13463 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 72931 | 63556 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 336 | 318 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 72595 | 63238 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | 427 | 27 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | |
| доходы от операций с активами | 093 | 67807 | 61883 |
| прочие операционные доходы | 099 | 4361 | 1328 |
| Операционные расходы | 100 | 70794 | 62997 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | | |
| расходы от операций с активами | 102 | 67857 | 62095 |
| прочие операционные расходы | 109 | 2937 | 902 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | 1801 | 241 |
| **III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 932 | 564 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 20 | 3 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 912 | 561 |
| Внереализационные расходы | 150 | 4497 | 4419 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -3585 | -3858 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | 32712 | 9846 |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 4741 | 2946 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 2829 | 22 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (+/-200+210-220) | 240 | 34624 | 12770 |
| Налог на прибыль | 250 | 2631 | 2710 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 1993 | 1737 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 117 | 75 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | 27971 | 5324 |
| **СПРАВОЧНО** (из строки 300): Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | 21921 | |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | | |
| Количество прибыльных организаций | 330 | 1 | 1 |
| Сумма полученной прибыли | 330А | 27971 | 5324 |
| Количество убыточных организаций | 340 | | |
| Сумма полученного убытка | 340А | | |

### Расшифровка отдельных внереализационных доходов и расходов

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | 82 | 28 | 54 | 11 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | 14 | 5 | 26 | 125 |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | | | | |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 157 | 966 | 278 | 1610 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 1 | 85 | 70 | 4 |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 658 | 3413 | 133 | 2669 |
| ИТОГО | 500 | 912 | 4497 | 561 | 4419 |

Фирменное наименование эмитента: **Отрытое акционерное общество «Слуцкий Сахарорафинадный комбинат»**
Местонахождение эмитента: **223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Головащенко, 6**
Банковские реквизиты эмитента: **ОАО «Белагропромбанк» г. Слуцка, код 921, р/с 3012200810018**

### Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на «1» января 2009 г.

5. Количество акционеров – всего 5973, в том числе юридических лиц – 22, физических лиц – 5951.
6. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 998 | 207 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 2971 | 616 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 464 | 349 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | — | — |

7. Информация о задолженности:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 14030 | 16231 |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | 206 | 4 |

9. Среднесписочная численность работающих (человек) — **711.**
10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров,продукции, работ, услуг: **сахар-песок**

# ХТО Ж НАС ВЫГАНІЦЬ? МЫ ПУСЦІЛІ КАРАНІ НА ВАКЗАЛЕ

**Вяртаючыся да надрукаванага**

**Пасля паездкі на выхадныя да бацькоў мяне заўсёды перапаўняюць уражанні. Найперш, ад самой паездкі. У матэрыяле «Звязды» «Месца для бамбіл» ад 29 кастрычніка мінулага года мы расказвалі, як людзі без усялякіх дакументаў і дазволаў на перавозку пасажыраў прапануюць гэтым самым пасажырам на ўваходзе на Маскоўскі аўтавакзал сталіцы па расцэнках, што і ў касе аўтавакзала, адвезці ў любы больш-менш значны пункт Віцебскай вобласці (Лепель, Віцебск, Новалукомль, Полацк і інш). Прычым адвезці значна хутчэй, чым маршрутны аўтобус, а магчыма, і танней на пару тысяч. Расказвалі, як паводзяць сябе гэтыя кіроўцы за рулём мікрааўтобусаў, парушаючы элементарныя правілы бяспекі і дарожнага руху. І задавалі шмат пытанняў Міністэрству транспарту і камунікацый, на некаторыя з якіх нават атрымалі адказы.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Так, за подпісам **начальніка ўпраўлення аўтамабільнага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый Ю.В. КАРАВАЙКІНА** нам адказалі, што «запатрабаванасць насельніцтва ў перавозках», у прыватнасці, па маршруце Мінск—Віцебск, «забяспечваецца ў поўным аб'ёме», што браніраваць білеты можна з дапамогай тэлеграмы з паведамленнем, па тэлефоне з магчымасцю зваротнай тэлефоннай сувязі (тэлефоны філіяла «Мінскі аўтавакзал» для атрымання даведачнай інфармацыі ці браніравання: 114 — для жыхароў Мінска, 8 902 1014 114 — для жыхароў Рэспублікі Беларусь) ці па інтэрнэце. Далей у лісце Мінтранса — пра барацьбу з «нелегаламі» ў сферы перавозак. Пра «мерапрыемствы па выяўленні і выкараненні фактаў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці» і ануляванне ліцэнзій тых, хто ёй займаўся (за 2007-2008 гады іх аж 57). З 1 ліпеня 2008 года прадугледжана крыху іншая арганізацыя перавозак пасажыраў, паведамілі нам. «Заключэнне дагавора аб фрахтаванні для аўтамабільнай перавозкі пасажыраў у нерэгулярных зносінах павінна пацвярджацца заказнарадам, які складаецца да пачатку выканання перавозкі пасажыраў. Бланкі заказ-нарада з'яўляюцца дакументам строгай адказнасці з уліковай серыяй і нумарам... Кіроўца пры выкананні перавозкі павінен мець на руках запоўнены бланк заказ-нарада. Уступленне ў сілу пунктаў Правілаў, якія датычацца выкарыстання заказ-нарада (з 1 студзеня 2009 года), дазволіць Транспартнай інспекцыі актывізаваць работу па выкараненні фактаў...» На такой аптымістычнай ноце заканчваецца ліст Мінтранса.

На дварэ канец сакавіка. Новыя пункты Правілаў дзейнічаць амаль тры месяцы. Субота, 21 сакавіка, Маскоўскі аўтавакзал. Я вырашаю працягнуць эксперымент з паездкай з прыватнікамі, хаця ў раскладзе ў гэты час ёсць аўтобус у маім віцебскім кірунку. На ўваходзе на тэрыторыю вакзала, як звычайна, сыплюцца прапановы: «Віцебск, Лепель, Новалукомль...» — «Мне да Лепеля спачатку. Потым да Бешанковічаў». Да Лепеля дамаўляемся ехаць за дваццаць тысяч. Далей кіроўца тэлефануе і высвятляе, хто з Лепеля едзе ў бок Віцебска. І паведамляе, што да Бешанковічаў будзе каштаваць 10 тысяч. — «Чаму дзесяць, калі ад Лепеля да Віцебска — 15? Бешанковічы — пасярэдзіне, атрымліваецца 7-8 тысяч». Кіроўцу нічога не застаецца, як пагадзіцца на восем. Падчас нашага торгу ідзе актыўны збор іншых пасажыраў. Траіх хлопцаў-студэнтаў кіроўца згодзен адвезці за 15 — гэтыя па цане аўтобуса не паедуць, лепш спадарожную машыну пашукаць.

Мікрааўтобус прыпаркаваны побач, на стаянцы перад Маскоўскім вакзалам. Зразумела, як маршрутны транспартны сродак ён ніяк не абазначаны, ніякай шыльды з пазначэннем маршруту. Не ведаю, якім чынам у транспартным патоку вылучае такіх парушальнікаў Транспартная інспекцыя, калі праводзіць свае праверкі. Затое ведаю, што варта толькі ёй з'явіцца, як гэта інфармацыя тут жа абляціць усіх прыватных перавозчыкаў. На працу выйдуць лічаныя адзінкі, бо парушэнні ёсць ва ўсіх.

Садзімся — я і яшчэ шасцёра пасажыраў. На вуліцы пачынае ісці мокры снег, надвор'е небяспечнае для паездак з неправераным кіроўцам, але эксперыменту гэта на карысць — вось і пабачым, як будуць выконвацца правілы дарожнага руху. Іх я пакуль ведаю — на носе экзамен у аўташколе. Але лепш бы не ведала — ехаць было б спакайней. Ад'ехаўшы ад вакзала, кіроўца нарэшце ўзгадвае пра рэмень бяспекі і прышпільваецца — выдатна. А за горадам я заўважаю, што рэмень вярнуўся на «сваё» месца — кіроўцу мне не шкада, шкада, што ў салоне для пасажыраў не прадугледжана рамянёў бяспекі. За горадам наша паласа — крайняя левая, тая, што для гоншчыкаў, мы апярэджваем нават тых, хто рухаецца па ёй. Наша хуткасць — 110-120, нягледзячы на тое, што траса Мінск—Віцебск — зусім не аўтамагістраль, і максімальная дазволеная хуткасць на ёй — 90. Кіроўца ігнаруе знакі абмежавання максімальнай хуткасці (ёсць участкі, дзе яна 70) і падчас паездкі стрэлка на спідометры ні разу не апускалася за адзнаку 100. А мне, як на зло, прыходзяць у галаву словы выкладчыка аўташколы, што ўсе абмежаванні на дарогах — невыпадковыя, а Правілы дарожнага руху напісаны крывёй.

Мая радзіма сустракае нас шчытом «Віцебшчына вітае дысцыплінаваных кіроўцаў» (гэта не пра нас, зразумела) і яшчэ больш моцным снегам — сапраўднай завірухай. На ўездзе ў Бягомль над дарогай інфармацыйны шчыт з чырвоным надпісам «Слізка» — дарэмна казаць, што на нашай хуткасці гэта ніяк не адбіваецца. Кіроўца размаўляе па мабільным тэлефоне, пераключае радыёстанцыі ў пошуках прыемных мелодый. На выпуску навінаў робіць гук мацнейшым. Напрыканцы прагноз надвор'я. «...У найбліжэйшыя суткі па ўсёй краіне чакаецца мокры снег... Уначы замаразкі. На дарогах галалёдзіца... Дзяржаўтаінспекцыя паведамляе, што за мінулыя суткі на дарогах рэспублікі адбылося 5 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінула 5 чалавек. Нагадваем кіроўцам: будзьце ўважлівымі і асцярожнымі, вытрымлівайце бяспечную дыстанцыю і выконвайце хуткасны рэжым. Падчас паездак на далёкія адлегласці старайцеся не глядзець у адну кропку, каб не прывыкаць да хуткасці»... Кіроўца свае высновы зрабіў — пакруціў галавой у розныя бакі, і дастаткова. Сама сабе думаю: хутчэй бы скончылася гэта паездка.

У Лепелі, калі разлічваюцца і выходзяць усе пасажыры (за паездку на адлегласць у 170 км таксіст атрымаў 125 тысяч), пытаю ў кіроўцы: «Не ганяюць вас на Маскоўскім вакзале?» — «Ганяюць за тое, што адбіраем кліентаў, толькі хто ж нас выганіць? Мы там карані пусцілі. Як адчыніўся пасля будаўніцтва Маскоўскі, так там і працуем». — «Усе працуюць так жа «афіцыйна», як і вы?» — «Само сабой. Што, не верыце, што афіцыйна?» Кіроўца аднекуль выцягвае папку з дакументамі і з гэтага моманту пачынае размаўляць са мной падкрэслена ветліва. «Вось аплата адзінага падатку, вось ліцэнзія на пасажырскія перавозкі, не, гэта мінулагодняя, вось сёлетняя. Вось страхоўка пасажыраў». — «Пакуль у мяне няма квітка, няма і страхоўкі. Дзе ваш касавы апарат?» — «Пад сядзеннем. Магу дастаць. Вам даць квіток? Вось вы думаеце, што мы тут грошы каўшом заграбаем. Зусім не. Я тры разы на тыдзень з'ездзіў — і ўсё. Не хочацца кожны раз запаўняць пуцёўкі». — «Чаму ездзіце з хуткасцю 110?» — «Дык гэта ж дзіцячая хуткасць». (Шкадую, што ў гэты момант нас не чуе мой інструктар па ваджэнні. Калі я за рулём і стрэлка спідометра набліжаецца да лічбы 70, атмасфера ў машыне робіцца нервовай. Калі яна на лічбе 70, інструктар крычыць: «Адпусці педаль газу!», пасля чаго нязменна атрымліваю папераджальны ўдар па правай назе.) — «Чаму ў вас на лабавым шкле расколіны?» (Правілы не дазваляюць эксплуатацыю аўтамабіля з расколінай у зоне шклоачышчальніка — **Аўт.**) — «Дык калі праходзіў тэхагляд, іх не было». — «А дзе ў вас запасны выхад?» — «Ёсць, і дзверы адчыняюцца знутры — гэта самае галоўнае. Трэба толькі надпіс зрабіць, ды ўсё няма часу». Кіроўца яўна збянтэжаны і шмкнецца зразумець, хто я. З падатковай ці транспартнай інспекцыі? Ці яшчэ адкуль? Ясна адно: звычайныя пасажыры з бескарыслівай цікаўнасці такія пытанні не задаюць.

